# ЮБІЛЕЙНАЯ КНІЖНАЯ ВЫСТАЎКА

У будынку Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі імя В. І. Леніна ў адзнаку 20-годдзя Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі адкрылася юбілейная выстаўка.

На выстаўцы сабраны каля тысячы экспанатаў—кніг, плакатаў, дыяграм, фото, схем, ярка ілюструючых вялікую соцыялістычную рэволюцыю і перамогі СССР за 20 год.

Шырока прадстаўлен аддзел «Партыя большэвікоў на чале з Леніным і Сталіным на подступах да Кастрычніка і ў барацьбе за пабудову комуністычнага грамадства».

Пад шклом вітрын і на шчытах ляжаць творы класікаў марксізма-ленінізма на 75 мовах народаў СССР, Сталінская Канстытуцыя і даклад таварыша Сталіна на Надзвычайным VIII З'ездзе Советаў на 60 мовах, у тым ліку на мовах шорскай, табасарайскай, талынскай, цыганскай і інш.

Вялікую цікавасць выклікае збор рэдкіх выданняў класікаў сусветнай і рускай літаратуры і народнай творчасці, як «Слово о полку Игореве» ў выданні Акадэміі навук СССР, «Витязь в тигровой шкуре» — Руставелі, совецкія выданні твораў Рамен Ролана, Герцэна і т. д.

На выстаўцы паказана работа Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі імя Леніна за 15 год. Бібліятэка ператварылася ў адну з буйнейшых кнігахавальняў Саюза. У 1926 годзе тут налічвалася 30 тысяч тамоў, а цяпер да 2 мільёнаў тамоў. Яе шматлікія чытальні і кабінеты штодзённа наведваюць каля тысячы студэнтаў, настаўнікаў, навуковых работнікаў, рабочых